# БІБЛІЯТЭКА НЯСВІЖСКАЙ АРДЫНАЦЫІ КНЯЗЁЎ РАДЗІВІЛАЎ ПАДЧАС ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ВА ЎСПАМІНАХ АПОШНЯГА АРХІВАРЫУСА РАДЗІВІЛАЎ Б. ТАЎРАГІНСКАГА


***А. М. Латушкін***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, Latushkin@bsu.by*



Артыкул прысвечаны даследаванню лёсу кніжных збораў Радзівілаў, ардынатаў Нясвіжскіх падчас Другой сусветнай вайны. Аўтар разглядае тэму праз успаміны апошняга архіварыуса названай галіны роду Радзівілаў – Баляслава Таўрагінскага (Туган-Таўрагінскага) (1904–1974). Ён прыводзіць каштоўныя звесткі: аб крадзяжы кніг з Нясвіжскай бібліятэкі ў Мінску нямецкімі вайскоўцамі; аб спробе гандлю імі праз антыкварыяты Польшчы (Варшава) і Германіі; аб слядах прыватнай бібліятэкі, якая магла належыць Радзівілам, у маёнтку Хрусты (польск. – Chrósty) пад Катавіцамі (Польшча) ў чэрвені 1945 г. Аўтар упершыню публікуе фрагменты ўспамінаў Баляслава Таўрагінскага са складу яго неапублікаванай кнігі “З гісторыі Архіва Радзівілаў і каштоўнасць дакументальнага збора для польскай навукі” (1969 г.).



***Ключавыя словы:*** князі Радзівілы; Нясвіжскі замак; Нясвіжскі архіў; Архіў Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў; Архіў Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў у Варшаве; Бібліятэка князёў Радзівілаў у Нясвіжы; Бібліятэка Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў; архівырыусы Архіва Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў; Баляслаў Таўрагінскі; Другая сусветная вайна


# БИБЛИОТЕКА НЕСВИЖСКОЙ ОРДИНАЦИИ КНЯЗЕЙ РАДЗИВИЛЛОВ ВО ВРЕМЯ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ В ВОСПОМИНАНИЯХ ПОСЛЕДНЕГО АРХИВАРИУСА РАДЗИВИЛЛОВ Б. ТАВРАГИНСКОГО


***А. Н. Латушкин***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, Latushkin@bsu.by*



Статья посвящена исследованию судьбы книжных собраний Радзивиллов, ординатов несвижских в годы Второй мировой войны. Автор рассматривает тему через призму воспоминаний последнего архивариуса этой ветви семьи Радзивиллов – Болеслава Таврагинского (Туган-Таврагинского) (1904–1974). Он приводит ценную информацию: о краже книг из Несвижской библиотеки в Минске немецкими военными; о попытке их реализации через антиквариаты Польши (Варшава) и Германии; о следах одной из частных библиотек, которая могла принадлежать Радзивиллам, в имении Хрусты (польск. – Chrósty) под Катовицами (Польша) в июне 1945 г. Автор впервые публикует фрагменты воспоминаний Болеслава Таврагинского, помещённые в его неопубликованной книги «Из истории Архива Радзивиллов и значение документального собрания для польской науки» (1969 г.).



***Ключевые слова:*** Князья Радзивиллы; Несвижский замок; Несвижский архив; Архив Несвижской ординции князей Радзивиллов; Архив Несвижской ординции князей Радзивиллов в Варшаве; Библиотека князей Радзивиллов в Несвиже; Библиотека

Несвижской ординции князей Радзивиллов; архивариусы Радзивиллов; Болеслав Таврогинский; Вторая мировая война

# THE LIBRARY OF THE NESVIZH ORDINATION OF PRINCES OF THE RADZIWILLS DURING THE SECOND WORLD WAR IN MEMORIES OF THE LAST ARCHIVARIUS OF THE RADZIWILLS B. TAVRAGINSKY

***A. N. Latushkin***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus. Corresponding author: Latushkin@bsu.by*

The article is devoted to the study of the fate of the book collections of the Radziwills, Nesvizh ordinates during the Second World War. The author examines the topic through the prism of the memories of the last archivist of this branch of the Radziwill family – Boleslav Tavraginsky (Tugan-Tavraginsky) (1904-1974). He provides valuable information: on the theft of books from the Nesvizh library in Minsk by the German military; an attempt to implement them through antiques from Poland (Warsaw) and Germany; about the traces of one of the private libraries, which could have belonged to the Radziwills, in the Chrusty (Polish - Chrósty) estate near Katowice (Poland) in June 1945. For the first time, the article publishes fragments of the memoirs of Boleslav Tavraginsky, placed in his unpublished book "From the history of the Radziwill archives and the significance of this documentary collection for Polish science" (1969).

***Key words:*** Princes of the Radziwills; Nesvizh Castle; Nesvizh Archive; Archive of Nesvizh Mayorat of Princes Radziwills; Archive of Nesvizh Mayorat of Princes Radziwills in Warsaw; Library of Princes Radziwills in Nesvizh; Library of Nesvizh Mayorat of Princes Radziwills; Archivarius of the Boleslav Tavroginsy; World War II

Баляслаў Таўрагінскі (Туган–Таўрагінскі) (1 мая 1904 г., Радзівілімонты, Нясвіж — 5 ліпеня 1974 г., Варшава) – асоба, што мае вялікае значэнне для гісторыі архіўнай спадчыны роду князёў Радзівілаў, а з улікам яе гісторыка–культурнай каштоўнасці – і ў цэлым для архівазнаўства Польшчы і Беларусі першай паловы XX ст. Ён быў апошнім архіварыўсам Архіва Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў у Варшаве, той яго часткі, якая была вывезена з Нясвіжа ў міжваенны перыяд, амаль без страт перажыла Другую Сусветную вайну і зараз у сваёй масе захоўваецца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве (Archiwum Główny Akt Dawnych). Выратаванне архіва падчас апошняй сусветнай вайны па праву належыць Б. Таўрагінскаму. Жыццёвы шлях гэтага чалавека, а таксама яго роля як захавальніка аднаго з найкаштоўнейшых і найбагацейшых прыватных архіўных збораў Беларусі, у цяперашні час – аб'екта Сусветнай спадчыны UNESCO былі раней асветлены ў навуковай літаратуры прадмета [1; 2; 3; 4; 6; 7; 8].

З 1929 г. па 1944 г. Б. Таўрагінскі быў памочнікам архівіста Архіва Нясвіжскай ардынацыі ў Варшаве. З верасня 1939 г. па 1945 г. фактычна

з'яўляўся яго загадчыкам. З 1929 г. дакументы архіва размяшчаліся ў арэндаваным будынку па адрасе вул. Маршалкоўская, д. 113 (памяшканні 2 і 4). Гэта быў цэнтра горада – недалёка ад чыгуначнага вакзала і Старога места. У сувязі з небяспекай артылерыйскіх абстрэлаў данага раёну за перыяд акупацыі архіў некалькі разоў змяняў сваю лакацыю. У верасні 1944 г. збор быў вывезены гітлераўцамі на Захад. Увесь перыяд акупацыі Б. Таўрагінскі жыў пераважна ў Варшаве, пры архіве, прымаў меры па яго зберажэнні, вёў апрацоўку матэрыялаў. У 1955 г. ён напісаў працу, прысвечаную гісторыі Нясвіжскіх архіва і бібліятэкі [11]. Яна мела некалькі рэдакцый, пазнейшая з якіх называлася "З гісторыі Архіва Радзівілаў і каштоўнасць дакументальнага збора для польскай навукі" (1969 г.) [10; 9; 12]. Мэта яе заключалася ў раскрыцці важнасці гэтай часткі спадчыны княскага роду для навукі і культуры. Даная праца знаходзіцца ў падмурку гістарыяграфіі архіва і бібліятэкі Радзівілаў у Нясвіжы перыяду другой паловы XVIII – першай паловы XX стст. На жаль, яна засталася неапублікаванай і амаль не выкарыстоўваецца айчыннымі вучонымі. Разам з тым, як і іншыя часткі навуковай спадчыны архіварыуса, гэта даследаванне ўяўляе сабой цікавасць не толькі для архівазнаўцаў, генеолагаў, але і для музеёлагаў, мастацтвазнаўцаў і бібліятэказнаўцаў Беларусі. Так, напрыклад, частка асабістага архіва дзеяча, якая знаходзіцца ў складзе матэрыялаў Фундацыі А. Цеханавецкага пры архіве Каралеўскага замка ў Варшаве (Zamek Królewski w Warszawie, Archiwum, Fundacja ks. A. Ciechanowieckiego, Zbiór B. Tauraginskiego), утрымлівае некалькі дзесяткаў даваенных фотаздымкаў партрэтаў Радзівілаў з нясвіжскай галерэі і аўтарскія малюнкі Б. Таўрагінскага – копіі тых жа партрэтаў. У яго спадчыне згадваюцца таксама працы, прысвечаныя прыдворным дзеячам мастацтва Радзівілаў («Dane archiwalne o artystach na dworze ks. Radziwiłłów XVI–XIX w.»). Для бібліятэказнаўцаў могуць быць карыснымі з навуковай кропкі гледжання матэрыялы згаданага даследавання Б. Таўрагінскага, у прыватнасці, спецыяльна прысвечаны Бібліятэцы Нясвіжскай ардынацыі асобны раздзел, а таксама дадаткі да працы, сярод якіх, напрыклад, змешчаны ўзоры экслібрысаў.

Сувязь працы Б. Таўрагінскага з навукай аб кнізе заключаецца яшчэ і ў наступным. Адна з істотных асаблівасцей яго даследавання – апісанне прыжыццёвых падзеяў гэтага чалавека перыяду нямецка–фашысцкай акупацыі Варшавы і пасля яе. Да працы прыкладзеныя таксама ў якасці дадатку арыгіналы афіцыйных паведамленняў улад, асабістая перапіска ўказанага перыяду. Фактычна гэта частка працы ўяўляе сабой самастойную гістарычную крыніцу – успаміны, што суправаджаюцца дакументальнымі сведчаннямі. Яна змяшчае цэлы шэраг важных звестак аб

розных аспектах жыцця архіварыуса ў азначаны час, аб яго прафесійнай дзейнасці ў надзвычайных умовах вайны, сведчанне вернасці справе, высокай адказнасці за збор у сітуацыі адсутнасці падтрымкі з боку саміх гаспадароў – Радзівілаў, дэманстрацыя ўсведамлення культурнай каштоўнасці архіва для народаў Еўропы. Акрамя архіва падчас і пасля Другой Сусветнай вайны Б. Таўрагінскі займаўся таксама пошукамі бібліятэкі Нясвіжскага замка (па яго даных на 1939 г. яна налічвала каля 20000 тамоў), вывезенай да вайны савецкімі ўладамі ў Мінск, а пазней у 1943 г. – нямецкімі акупантамі на Захад. Сярод матэрыялаў названай працы Б. Таўрагінскага маюцца важныя звесткі аб Нясвіжскай бібліятэцы ўказанага перыяду. Ніжэй публікуюцца фрагменты тэксту, якія закранаюць данае пытанне. Публікацыя выканана на аснове апошняй рэдакцыі працы – «З гісторыі Архіва Радзівілаў і каштоўнасць дакументальнага збора для польскай навукі» (Варшава, 1969 г.) [12, s. 74–76]. Пераклад з польскай мовы – аўтара артыкулу.

Фрагмент 1. «Частка рарытэтаў, што знаходзіліся ў Нясвіжскай бібліятэцы, эвакуяванай у Мінск у 1940 г., была выкрадзена адным нямецкім афіцэрам і прададзена часткова ў Варшаве, а часткова вывезена ў Рэйх. Так, 29 лістапада 1941 г. я атрымаў інфармацыю, што кнігі, якія паходзяць з Нясвіжскай бібліятэкі, знаходзяцца ў продажы ў Варшаве. Я распачаў пошукі па варшаўскіх антыкварыятах. У адным з іх, які трымалі пані Хамантоўская і Друцкая–Любецкая пад назвай фірмы “Крыяліна” на вітрыне ўбачыў кнігі, апраўленыя ў пергамін, якія паходзяць з Нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў. Я звярнуўся ў антыкварыят і высветліў, што гаспадары маюць вялікую колькасць гэтых кніг з экслібрысамі Радзівілаў. На маё пытанне “якім чынам кнігі аказаліся ў антыкварыяце” пані Друцкая–Любецкая паведаміла мне, што яны былі набытыя ў аднаго нямецкага афіцэра, які праязджаючы праз Варшаву, прадаў ім некалькі дзесяткаў экзэмпляраў. З далейшага паведамлення пані Друцкай–Любецкай вынікала, што той жа афіцэр прапанаваў ёй яшчэ некалькі скрынь з кнігамі, што паходзілі з бібліятэкі Радзівілаў у Нясвіжы, якія былі ў яго ў машыне. Аднак здзелка не была заключана па прычыне адсутнасці сродкаў і Друцкая–Любецкая накіравала нямецкага афіцэра да Януша Радзівіла. Толькі гітлераўскі афіцэр не паехаў у Нябораў, а паехаў у Берлін. У той час па Варшаве хадзіла версія, што нямецкі ўрад камандыраваў у Мінск знаўцу рарытэтаў, які адабраў іх з Нясвіжскай бібліятэкі і пачаў распрадаваць у Варшаве. Ведаючы аб тым, што кіраўнік Архіўнага ўпраўлення ў Варшаве доктар Бюткус ездзіў у Мінск з мэтай агляду нясвіжскіх збораў і мачымага іх перамяшчэння ў Варшаву, я звярнуўся ў Архіўнае ўпраўленне і склаў пісьмовы рапарт аб кнігах з Нясвіжскай

бібліятэкі Радзівілаў, якія знаходзяцца ў продажы, і аб версіі, якая хадзіла па Варшаве. На наступны дзень мяне выклікалі ў гестапа і ў суправаджэнні гестапаўцаў мы накіраваліся да антыкварыяту Друцкай–Любецкай. У выніку – кнігі былі канфіскаваныя і перавезеныя да Архіва Радзівілаў у Варшаве на вул. Маршалкоўскай. У далейшым ходзе справы Архіўнае ўпраўленне распачало расследаванне з мэтай выкрыцця крадзежу кніг у Мінску. З гэтай мэтай былі зробленыя фотаздымкі пячатак і экслібрысаў Нясвіжскай бібліятэкі. Яны былі разасланыя да ўсіх антыкварыятаў Рэйху з загадам затрымання гітлераўскага афіцэра, які спрабаваў прадаць кнігі. Праз месяц афіцэр быў затрыманы. У яго ўдалося забраць некалькі дзесяткаў экзэмпляраў, а таксама троху рарытэтных прадметаў рыцарскага ўзбраення. Трэба адзначыць, што выканаўца крадзежу кніг у Мінску жадаючы знішчыць сляды паходжання кніг з радзівілаўскіх збораў, павышкрабаў экслібрысы. Пячаткі ж з надрукаваным тэкстам «Biblioteka Ordynacji Nieświeskiej» былі выпаленыя свечкай.

Вось такая калі сціслa гісторыя саракатысячнага кнігазбору Нясвіжскай бібліятэкі, якая старанна збіралася з XVI стагоддзя кожным чарговым нясвіжскім ардынатам. І на кнігазборы, як і на скарбніцы Радзівілаў, легла клятва Нібелунгаў і прарочыя словы, вымаўленыя на сваім перадсмяротным ложы князем “Пане Каханку”: «Будзе радзівілаўшчына – пазнішчаная, разыйдзецца–разцярушыцца і знікне». Гэта – спраўдзіліся.

Фрагмент 2. «Адна з частак Нясвіжскай бібліятэкі, якая знаходзілася ў Нясвіжскім замку на 1939 г., была вывезена гітлераўцамі [з Мінску ? – А.Л.] і апынулася ў Апольскай Сілезіі у маёнтку Козьле. 2 чэрвеня 1945 г. па загаду Сухадольскага, вярхоўнага дырэктара дзяржаўных архіваў, я быў камандыраваны ў маёнтак Хрусты з мэтай устанаўлення кантролю і магчымага вывазу гэтай бібліятэкі ў Чэнстахову. Па дарозе я заехаў у Катавіцы і звярнуўся ў ваяводзкі орган улады ў галіне Асветы з мэтай атрымання больш дакладных звестак аб нясвіжскім кнігазборы. Намеснік кіраўніка аддзела паінфармаваў мяне, што бібліятэка Радзівілаў знаходзіцца ў маёнтку Хрусты і савецкія ўлады на падставе пагаднення з Урадам Польшчы ў справе далучэння ўсходніх тэрыторый да СССР засведчылі аддзелу Асветы ваяводства, што гэтыя зборы належаць ім. Аднак 4 чэрвеня 1945 г. я ўсё ж накіраваўся ў маёнтак Козьле, каб на свае вочы ўбачыць стан спраў. У той жа дзень з намеснікам старасты і земскім інспектарам мы выехалі на аўтамабілі з Козьля ў маёнтак Хрусты. Па дарозе нам паведамілі, што савецкія войскі 3 чэрвеня 1945 г. пакінулі маёнтак Хрусты. Калі мы прыехалі ў маёнтак, то ўбачылі дагараючы

палац, у якім і знаходзіўся нясвіжскі кнігазбор. На прадмет гэтага мы склалі пратакол”.

Гісторыя Нясвіжскай бібліятэкі, нават на яе савецкім этапе, даследавана, на наш погляд, крайне недастаткова. Разам з тым, з улікам важнасці як архіўных, так і кніжных збораў Радзівілаў – ардынатаў нясвіжскіх для гісторыі і культуры Беларусі, яна мусіць выступаць адным з прыярытэтных накірункаў навуковай распрацоўкі айчынных архіва- і бібіліятэказнаўцаў. Асоба Б. Таўрагінскага, захоўваючы сваю контраверсійнасць у кантэксце нацыянальнай гісторыі, яго працы, успаміны, асабісты архіў займаюць адно з асноўных месцаў у базе крыніц такіх даследаванняў.

***Бібліяграфічныя спасылкі***


1. Латушкін, А.М. Архіварыусы Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX ст. / А.М. Латушкін // Асоба ў гісторыі: гераічнае і трагічнае: матэрыялы Др–й міжнар. навук.–прак. канф., прысв. памяці праф. У.У. Мелішкевіча, Брэст, 12 – 13 лістапада 2004 г. / Брэст. дзярж. ун–т імя А.С. Пушкіна; рэд. А.М. Вабішэвіч [і інш.]. Брэст, 2006. С. 106–112.

2. Латушкін, А.М. Гісторыя польскай і беларускай частак Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў падчас Другой Сусветнай вайны / А.М. Латушкін // Содружество наук. Барановичи–2005: материалы междунар. науч.–практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 22 февраля 2005 г.: в 2 ч. / Баранов. госуд. ун–т; редкол.: В.И. Кочурко (гл. ред.) [и др.]. Барановичи, 2005. Ч. 1. С. 217–219.

3. Латушкін, А.М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў (1914–1941 гг.) / А.М. Латушкін // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / Гістарычны факультэт Беларус. дзярж. ун–та. Мінск, 2006. Вып. 1 С. 193–199.

4. Латушкін, А.М. Таўрагінскі (Туган–Таўрагінскі) Баляслаў / А.М. Латушкін // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / Склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка; навук. рэд. У. І. Адамушка, В. У. Бірукова. Мінск: БелНДІДАС, 2006. С. 213–215.

5. Латушкін, А.М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у канцы XVIII – першай палове XX стст.: дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук: 05.25.02: абаронена 29.11.07: зацверджана 06.02.08 (на правах рукапісу) / Андрэй Мікалаевіч Латушкін. Мінск, 2007. С. 291–294.

6. Латушкін, А.М. Архівісты Нясвіжскага архіва Радзівілаў (частка V, літары “С” – “Я”) / А.М. Латушкін // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 10. Мінск: БелНДІДАС, 2012. 296 с.

7. Латушкін, А.М. Новыя крыніцы па гісторыі дзейнасці архіварыусаў Архіва Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў / А.М. Латушкін // Архіварыус. – Вып. 14. – 2016. – С. 375–380.

8. Латушкін, А.М. Таўрагінскі (Туган–Таўрагінскі) Баляслаў [1904–1974] / А.М. Латушкін // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / склад. С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. Мінск: БелНДІДАС, 2020. С. 253–254.

9. AGAD. Archiwum Radziwiłłów, t. zw. Warszawaski. Dz. XXVII. Sygn. 143, Tuhan–Taurogiński, B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej, 1969 r.

10. AGAD. Spuścizne Adama Stebelskiego. Akta nie sygnowane, nr. tymczasowy 42. Tuhan–Taurogiński B. Przyczynek do historii Archiwum Radziwiłłów. Warszawa, 30.10.1957.

11. Biblioteka Narodowa w Warszawie, Rps. akc. 9067, część 1, Tuhan–Taurogiński B. Geneza powstania Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1955 r. – 96 s. Załącznik (машынапіс).

12. Biblioteka Narodowa w Warszawie, Rękopis 9067, część 2, Tuhan–Taurogiński B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. Warszawa, 1969 r. – 110 s. (машынапіс).

13. Lewak, A. The Archives and Libraries of Warsaw during World WAR II, 1939–1945 / Adam Lewak, Anna M. Lipska, Irene M. Sokol // The Polish Review. Vol. 7, No. 2, Spring 1962. PP. 3–39.